*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**15** МАЯ 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 88
(26201)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Акцыі

## ЗАКАХАНЫХ ЗАПРАШАЮЦЬ САЛАЎІНЫЯ НОЧЫ

**Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) сумесна з Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя наладжвае 17—18 мая ў сталіцы акцыю «Салаўіныя ночы». Мэтай акцыі будзе не толькі знаёмства мінчан з гэтым начным спеваком, але і падлік колькасці салаўёў, выяўленне праблем птушак і вызначэнне месцаў іх пражывання.**

Прылёт салаўёў у Беларусь з месцаў зімоўкі ў Паўднёва-Ўсходняй Афрыцы пачынаецца ў апошнія дні красавіка — пачатку мая, — паведаміў рэдакцыі спецыяліст па экалагічнай адукацыі АПБ Руслан Шайкін. — Першымі ў Мінск прылятаюць самцы. Адразу пасля прылёту яны пачынаюць спяваць. Песня для гэтых невялікіх птушак мае некалькі значэнняў. Спевамі самцы запрашаюць на выбраны ўчастак будучых сябровак, а таксама паведамляюць іншым салаўям-канкурэнтам аб тым, што гэты ўчастак ужо заняты для гнездавання. Песня салаўёў складаецца з асобных цэльных куплетаў, якія арнітолагі называюць каленамі. Звычайна ў песні салаўя не больш за 10 кален, і па іх колькасці вызначаюць лепшых вакалістаў. Спевы салаўя ў галінках квітнеючай чаромхі напрыканцы дня для закаханых з'яўляецца бадай самым яркім і рамантычным знакам вясны.

Дзіўна, але ў вялікіх гарадах ёсць людзі, якія ніколі не чулі салаўя або не звярталі ўвагі на крылатага віртуоза. Асабіста я ведаю каля 15 пунктаў у прыватным сектары Мінска, дзе менавіта цяпер увечары і раніцай выразна і распазнавальна спяваюць салаўі. **У рамках акцыі «Салаўіныя ночы» 17 мая з 10.00 да 16.00 у Цэнтральным батанічным садзе будзе арганізавана спецыяльная пляцоўка,** на якой можна будзе паслухаць салаўёў, атрымаць кваліфікаваныя адказы на ўсе пытанні аб салаўях і іншых птушках ад прафесійных арнітолагаў, паназіраць за салаўямі і іншымі відамі крылатых. Кожны ўдзельнік акцыі бясплатна атрымае поўнакаляровы буклет "Салаўіныя ночы" і змога паназіраць за птушкамі з дапамогай бінокляў і падзорных труб.

Прыняць удзел у падліку салаўёў у галоўным мегаполісе краіны можа кожны мінчанін і госць сталіцы. Дзеля гэтага дастаткова наведаць бліжэйшы парк ці сквер і паслухаць салаўёў, звярнуць увагу на гэтых птушак падчас адпачынку. У зялёных раёнах горада гэта магчыма зрабіць непасрэдна з балкона кватэры. Аб месцазнаходжанні спяваючага салаўя арганізатары акцыі просяць паведамляць па тэлефонах:

+375 (17) 263 06 13, +375 (17) 263 01 30 (стацыянарныя апараты)
+375 (29) 223 06 13, +375 (29) 101 68 87 (мабільныя тэлефоны).

Званіць 17—18 мая можна ў любы час сутак, нават уначы.

Пасля апрацоўкі атрыманай інфармацыі спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» плануюць скласці карту распаўсюджвання гэтых птушак у горадзе, выявіць рэгіёны, дзе салаўі зніклі, а дзе наадварот — з'явіліся. З дапамогай добрых людзей арнітолагі змогуць амаль дакладна падлічыць колькасць салаўёў, якія жывуць у Мінску, выявіць, як вагаецца іх колькасць у розныя гады і якія праблемы сустракаюць птушкі ў буйным горадзе.

Салаўёў у гэтыя выхадныя будуць уважліва слухаць у сямі населеных пунктах краіны, бо акцыя «Салаўіныя ночы» акрамя сталіцы будзе праведзена таксама ў Слоніме, Кобрыне, Шуміліне, Мядзелі, Сянно і Жодзіне. У гэтых раёнах кіраваць падлікам птушак будуць мясцовыя службы АПБ.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прамая лінія

### Калі ў вушах шуміць і звініць

Згодна са статыстыкай, ад 4 да 6 працэнтаў жыхароў нашай планеты пакутуюць ад тых ці іншых парушэнняў слыху. Якія асноўныя прычыны ўзнікнення захворванняў вуха? Ці можна папярэдзіць заўчаснае аслабленне слыху? Наколькі эфектыўныя сучасныя слыхавыя апараты? Што рабіць, калі ў вушах шуміць і звініць?

На гэтыя і іншыя пытанні падчас нашай чарговай «прамой лініі» адкажа **загадчыца дарослага сурдалагічнага аддзялення Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і мовы Ніна Юр'еўна КАСЦЮК.** ***«Прамая лінія» адбудзецца 20 мая, у аўторак, з 16.30 да 18.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шайко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

### Пераможам жаночы рак

На пытанні адкажуць **загадчыца аддзела анкагінекалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА і загадчык аддзела анкамаммалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Леанід Аляксеевіч ПУТЫРСКІ.** ***Свае пытанні вы можаце пакінуць у рэдакцыі газеты па нумары 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) да 17 мая.***




## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ ПАЎГОДДЗІ!

**Ідзе падпіска на II паўгоддзе і III квартал 2008 года**

**Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 | 55200 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 | 52200 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 | 88200 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 | 80400 |

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАЧЫНАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ

**З 15 мая ў краіне пачнецца летне-восеньскі сезон палявання на дзіка на патравах сельскагаспадарчых культур.**

З засады, з падыходу, з падманьваннем можна будзе паляваць на дарослых самцоў, старэйшых за два гады, і маладняк да двух гадоў любога полу. З гэтай жа даты дазваляецца і індывідуальныя трафейная і селекцыйная здабыча з засады, з падыходу, з падманьваннем казулі.

### ТОК ДАВАЎ СВЯТЛО І БІЎ РЫБУ

**Менавіта такую «канструкцыю» выявілі супрацоўнікі дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Нарачанскі» на беразе возера Нарач паблізу рэстарана.**

700 метраў провада (з іх 400 метраў праходзіла пад зямлёй) былі падключаны да мачты вулічнага асвятлення. Пры ўключэнні святла ток падаваўся і на провад у вадзе. Апошні быў адключаны і канфіскаваны. А з дна возера паднялі 138 асобінаў розных відаў рыбы (у тым ліку 129 асобінаў вугра) агульнай вагой 81 кілаграм. Урон зламыснікамі быў нанесены ў асабліва буйным памеры — каля 2000 базавых велічынь (70 мільёнаў рублёў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### МІЛЬЁНЫ БУХГАЛТАРА

**Былому галоўнаму бухгалтару Цэнтралізаванай бухгалтэрыі ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска прад'яўлена абвінавачанне ў крадзяжы.**

Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, следствам устаноўлена, што пад кіраўніцтвам гэтай прадпрымальнай жанчыны дзейнічала арганізаваная група, у склад якой уваходзілі адказныя асобы і іншыя супрацоўнікі бухгалтэрыі (не менш за 5 чалавек). Карыстаючыся сваімі паўнамоцтвамі, гэтыя людзі выкрадалі грошы ўпраўлення адукацыі, якія выдзяляліся для выплаты зарплаты работнікам сярэдніх школ, дзіцячага дома, дзіцячых садкоў і прыёмных сем'яў Фрунзенскага раёна. На працягу 2004—2007 гадоў у спісы на залічэнне зарплаты прайдзісветы ўносілі заведама несапраўдныя звесткі аб атрымальніках і сумах, пасля чаго грошы пералічваліся ў банк на карт-рахункі саўдзельнікаў, сваякоў і знаёмых — супрацоўнікаў упраўлення адукацыі, якія мелі пластыкавыя банкаўскія карткі. Каб было зразумела, які капітал асеў у кішэнях зламыснікаў, заўважым, што штомесяц на працягу трох гадоў імі неабгрунтавана налічваліся грашовыя сродкі ад 140 тысяч рублёў да 7 мільёнаў. Агульны ж урон, нанесены аферыстамі, склаў больш за 314 мільёнаў рублёў. Галоўны бухгалтар узята пад варту.

### ТАКІ ВОСЬ ПАЛКОЎНІК?..

**Генеральнай пракуратурай Беларусі па матэрыялах галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да былога намесніка начальніка УУС Мінаблвыканкама — начальніка ўпраўлення кадраў (статс-сакратара), палкоўніка міліцыі.**

Падазраецца 44-гадовы сталічны жыхар у тым, што ў жніўні 2007 года, прадставіўшы несапраўдныя дакументы ў жыллёва-бытавую камісію згаданага УУС і адміністрацыю Фрунзенскага раёна Мінска, атрымаў службовую трохпакаёвую кватэру. Акрамя таго, ён падазраецца ў тым, што ў перыяд з лета мінулага года па студзень гэтага даваў указанні залежным ад яго па службе адказным асобам па арганізацыі будаўніцтва дачнага дома ў Мядзельскім раёне, рамонту дачнага дома і будаўніцтва лазні ў Стаўбцоўскім раёне з выкарыстаннем асуджаных, якія адбывалі пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ЖАНЧЫНА З СЕТКАЙ. БРАКАНЬЕРСКАЙ

**На жаль, колькасць выпадкаў браканьерства, нягледзячы на суровыя пакаранні, застаецца даволі вялікім.**

Мужыкоў з ружжамі ці сеткамі яны не спыняюць. А вось каб праваарушальнікам была жанчына, такое здараецца не вельмі часта. Работнікі Віцебскай аблінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету на возеры Вымна Гарадоцкага раёна быў затрыманы менавіта такі браканьер — грамадзянка, якая падчас веснавой забароны на лоўлю рыбы здабывала яе забароненымі прыладамі, сеткамі. Канфіскаваны тры сеткі агульнай даўжынёй 155 метраў і 59 асобінаў розных відаў рыбы. Урон прыродным рэсурсам склаў больш за 1,9 мільёна рублёў. На месца, як і належыць, выклікалася следча-аператыўная група мясцовага РАУС, пасля матэрыялы былі накіраваны ў пракуратуру Віцебскай вобласці для разгляду пытання аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Парламенцкі дзённік

## Дэпутаты прынялі законапраекты, якія пашыраць правы грамадзян у атрыманні якаснага медыцынскага абслугоўвання і будаўніцтва жылля

**Пятнаццаць законапраектаў, якія закранаюць самыя розныя сферы жыцця нашага грамадства, разгледзелі ўчора на пленарным пасяджэнні дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.**

У прыватнасці, у другім чытанні разглядаўся **праект закона «Аб ахове здароўя».** Гэтым законапраектам, дакладней — прапанаванымі змяненнямі і дапаўненнямі — удакладнены палажэнні дзеючага ў краіне закона аб ахове здароўя з улікам практыкі яго прымянення. Дэпутаты палічылі, што ёсць неабходнасць удасканаліць прававое рэгуляванне грамадскіх адносінаў у гэтай галіне, каб больш канкрэтна забяспечыць правы грамадзян на даступную і кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Аб гэтым заявіў міністр аховы здароўя Васіль Жарко. Паводле яго слоў, дакументам удакладнены шэраг паняццяў. «Законапраектам вызначана паняцце «эўтаназія», якая ў Беларусі забароненая», сказаў В. Жарко.

Як адзначыў, выступаючы перад дэпутатамі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Уладзімір Ісаеў, у праекце закона замацоўваецца права грамадзян на даступнае медыцынскае абслугоўванне, у тым ліку на бясплатную медыцынскую дапамогу ў дзяржустановах аховы здароўя за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Акрамя таго, у праект новай рэдакцыі закона ўвайшлі нормы, якія вызначаюць такія віды меддапамогі, як першасная і спецыялізаваная, формы — хуткая і планавая медыцынская дапамога.

У папраўках замацавана права грамадзян на атрыманне медыцынскай дапамогі за кошт асабістых сродкаў у дзяржаўных унітарных прадпрыемствах, арганізацыях аховы здароўя прыватнай формы ўласнасці і ў індывідуальных прадпрымальнікаў. Вызначана кола асобаў, якія маюць права паведамляць інфармацыю аб стане здароўя пацыента. У законапраекце таксама вызначаныя правы і абавязкі работнікаў аховы здароўя.

У другім чытанні разглядаўся і **праект закона «Аб іпатэцы».** Гэты нарматыўны акт рэгулюе адносіны ў сферы іпатэкі і стварае прававую аснову доўгатэрміновага іпатэчнага крэдытавання. У законапраекце пералічаныя падставы ўзнікнення іпатэкі, а таксама маёмасць, якая можа быць яе прадметам, абавязкі і патрабаванні, якія забяспечваюцца іпатэкай.

Вызначаецца паняцце закладной як каштоўнай паперы. Прадугледжана, што закладная складаецца заклададаўцам і выдаецца першапачатковаму закладатрымальніку арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомасці. Кожны наступны ўладальнік закладной абавязаны зарэгістраваць пераход да яго гэтага права ў Адзіным дзяржрэгістры нерухомай маёмасці. Адзін з важных абавязкаў заклададаўцы заключаецца ў тым, што ён павінен застрахаваць прадмет іпатэкі. Страхавы поліс у дадзеным выпадку з'яўляецца гарантыяй пры страце або пашкоджанні прадмета іпатэкі.

Галіна Палянская, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі, адзначыла, што прыняты законапраект пашырыць магчымасці грамадзян па набыцці жылля, забяспечыць развіццё будаўнічага комплексу, будзе стымуляваць банкаўскую дзейнасць, прывядзе да ажыўлення фінансавага рынку, рынку каштоўных папер, будаўнічага рынку. Разам з тым дэпутат падкрэсліла, што для развіцця іпатэкі ў краіне неабходна прыняць яшчэ некалькі законаў, у тым ліку аб будаўнічых зберажэннях.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прыняла таксама ў другім чытанні **законапраект «Аб ахове працы».** Як сказаў член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Іван Талкачоў, прыняцце гэтага дакумента абумоўленае неабходнасцю замацавання на заканадаўчым узроўні сістэмы рэгулявання грамадскіх адносінаў у галіне аховы працы. Законапраект утрымлівае артыкулы, якія рэгламентуюць дзейнасць работадаўцаў па забеспячэнні аховы працы.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

Рэйд Дзяржкантролю са «Звяздой»

## ЗДАЦЬ ТЭЛЕВІЗАР У РАМОНТ І... НЕ АТРЫМАЦЬ ЯГО НАЗАД

**І нават не знайсці канцоў — такая небяспека тэарэтычна маецца. Чарговы рэйд Камітэта дзяржкантролю, на які была запрошаная карэспандэнт «Звязды», быў накіраваны на тое, каб папярэдзіць падобныя выпадкі.**

Раніцай аўторка ад дома № 3 па вуліцы Карла Маркса ў Мінску ад'язджаюць тры аўтамабілі. На адным з іх — супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю, на другім — супрацоўнікі фінансавай міліцыі, на трэцяй — прэса. Пачынаецца рэйд па прыватных рамонтных майстэрнях тэлерадыёапаратуры. Яго мэта — вызначыць адрасы, па якіх так ці інакш парушаецца закон Беларусі аб абароне спажыўцоў. Адзін з супрацоўнікаў дзяржкантролю трымае ў руках красавіцкі нумар бясплатнай рэкламнай газеты з абведзенымі аб'явамі і кароткімі каментарыямі, якія зроблены алоўкам на палях. Начальнік аддзела кантролю сферы паслуг Павел Крэмень дастае з кішэні аркушык паперы, на якім тыя ж самыя аб'явы ўжо змешчаныя ў табліцу, астатнія калонкі якой запоўнены папярэдне сабранай інфармацыяй.

— Падобныя рэкламныя газеты мы называем вокнамі ў ценявую эканоміку, — тлумачыць Павел Крэмень. — Спачатку мы вылучаем з рэкламных аб'яў тыя, дзе прапанаваныя паслугі не сертыфікаваныя, хоць падлягаюць абавязковай сертыфікацыі. Напрыклад, рамантаваць тэлевізар не можа чалавек, які не мае адпаведнай прафесійнай падрыхтоўкі. Інакш тэлевізар можа не проста аказацца канчаткова сапсаваным, але і стаць прычынай трагедыі ў доме. Яшчэ адзін важны пункт праверкі — адрас майстэрні. Нярэдка майстэрні размяшчаюцца ў звычайнай кватэры, што з'яўляецца грубым парушэннем Жыллёвага кодэкса.

З гэтага і пачынаецца наш рэйд — мы едзем па адным з адрасоў на праспект Ракасоўскага. Супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю папярэджваюць журналістаў, што выезд можа аказацца «няўдалым». У гэтым і захоўваецца інтрыга нашага першага візіту падчас рэйду.

— У мінулы раз кватэра на вуліцы Прытыцкага, у якую прыйшлі нашы спецыялісты, не мела ніякіх прымет жылля, з мэблі, акрамя вялізнай колькасці тэлевізараў розных марак і іншай апаратуры, былі толькі крэсла, тры сталы з інструментамі і дыягнастычным абсталяваннем. Нашы супрацоўнікі ўвайшлі туды як звычайныя кліенты, але як толькі ўбачылі, **што** ў кватэры — адразу адрэкамендаваліся, — расказвае прэс-сакратар Камітэта Кірыл Данілаў. — У ходзе далейшай праверкі высветлілася, што майстар гэты выкарыстоўваў у аб'явах назву фірмы, але працаваў цалкам на сябе. Ён працаваў у фірме і адначасова з'яўляўся прыватным прадпрымальнікам. Праверка выявіла, што за тры з паловай месяцы ён выканаў каля 700 заказаў на рамонт бытавой радыёэлектроннай апаратуры, электра-бытавых машын і тэлефонных апаратаў. Аказанне паслуг па рамонту гэтай тэхнікі магчыма толькі пры наяўнасці сертыфіката, якога ў прадпрымальніка не было. Грашовыя сродкі ад спажыўцоў ён клаў сабе ў кішэню. Толькі пасля з'яўлення ў майстэрні прадстаўнікоў Дзяржаўнага кантролю ён упершыню за тры апошнія месяцы выпісаў дакумент, які пацвярджаў прыём грошай.

На гэты раз двое супрацоўнікаў, мужчына і жанчына, паднімаюцца з невялікім старым тэлевізарам маркі «Юность» на восьмы паверх жылога панэльнага дома. Аднак дамовіцца з гаспадаром «майстэрні» адрамантаваць тэлевізар не ўдалося. Мы з'язджаем з праспекта Ракасоўскага з пустымі рукамі. Праверыць, наколькі гэты чалавек парушае закон, пакуль не атрымалася. Супрацоўнікі Дзяржкантролю набіраюць другі тэлефон і дамаўляюцца аб сустрэчы на гэты раз у двары дома па вуліцы Заслаўскай.

Цяпер падзеі разгортваюцца на вачах ва ўсіх. Мы загадзя выйшлі з машыны, у якой застаўся «кліент» з няспраўным тэлевізарам. Аляксандр Паўлавіч пазваніў з сотавага тэлефона яшчэ раз майстру, і той выйшаў з бліжэйшага пад'езда. Зірнуў на тэлевізар і перанёс яго ў сваю машыну.

— А якое вы мне пакінеце пацвярджэнне, што мой тэлевізар сапраўды ў вас? — спытаўся Аляксандр Паўлавіч.

— У вас жа ёсць нумар майго тэлефона, — адказаў майстар, — вы можаце пакінуць мне свой. Адрамантую і пазваню вам.

Гэта была ўжо нагода для таго, каб супрацоўнікам дзяржкантролю і фінансавай міліцыі адрэкамендавацца і патлумачыць сапраўдную мэту сустрэчы. Бо просты абмен тэлефонамі — недапушчальнае парушэнне правоў спажыўца. Дзе гарантыя, што гаспадар тэлевізара дазвоніцца да чалавека, якому ён гэты тэлевізар аддаў з мэтай рамонту? У дадзеным выпадку, як аказалася пасля праверкі дакументаў, такога не адбылося б. Сяргей Барысавіч — зарэгістраваны прыватны прадпрымальнік, які мае сертыфікат на сваю дзейнасць, адпаведную адукацыю, плаціць адзіны падатак і сапраўды, напэўна, сумленна рамантуе тэлевізары і вяртае іх гаспадарам. Але на яго месцы можа аказацца і зламыснік, які скарыстаецца даверам спажыўца.

— Безумоўна, я вінаваты, — пракаментаваў для журналістаў невясёлую сустрэчу з удзельнікамі рэйду тэлемайстар Сяргей Барысавіч. — Я не маю права браць да сябе тэлевізары. Мой сертыфікат дазваляе мне рамантаваць іх па месцы эксплуатацыі — дома ў кліента. Да таго ж, я павінен выдаць гарантыйны талон, дзе ёсць усе мае дакладныя каардынаты. Спадзяюся, што мая віна акажацца не настолькі цяжкай, каб мне забаранілі займацца гэтай дзейнасцю, бо гэта — значная крыніца даходу маёй сям'і. Іншым прадпрымальнікам скажу толькі — не парушайце закон нават у дробязях.

Сяргей Барысавіч напісаў тлумачальную запіску і атрымаў з рук супрацоўнікаў дзяржкантролю пералік дакументаў, з якімі ён павінен будзе прыйсці да іх. Бо тое, што адбылося на вуліцы Заслаўскай, — толькі нагода для праверкі яго дзейнасці як прадпрымальніка. Пасведчанне прадпрымальніка, сертыфікат, дыплом, квітанцыі, якія сведчаць пра плату адзінага падатку, Кніга скаргаў і прапаноў, пералік тарыфаў на паслугі, бланкі для гарантыйных талонаў пэўнай формы, Кнігу рэгістрацыі праверак, правілы бытавога абслугоўвання — усё гэта ён павінен будзе прадаставіць у аддзел кантролю сферы паслуг Камітэта дзяржкантролю.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Наступным адрасам у рэйдзе стала стацыянарная майстэрня ў Доме быта на адной з невялікіх вуліц у цэнтры сталіцы. Падазрэнне кантралёраў выклікала тое, што сертыфікат быццам бы мае адзін майстар, а тэлевізары прымае — іншы. Супрацоўнікі камітэта здалі тэлевізар у рамонт і дачакаліся, калі ён будзе адрамантаваны, каб праверыць, якія дакументы будуць выдадзены на рукі спажыўцу пасля завяршэння работы. Пры прыёме тэлевізараў у рамонт тут не быў аформлены бланк заказу ўсталяванага ўзору. На наступны дзень супрацоўнікі аддзела кантролю сферы паслуг пры атрыманні адрамантаванай тэхнікі ўпэўніліся ў тым, што ўладальнік майстэрні прыняў грошы за выкананую работу з парушэннем заканадаўства.

— Такія рэйдавыя праверкі — адна з формаў работы нашага падраздзялення, — рэзюмаваў праведзеную ў гэты дзень работу Павел Крэмень. — Калі мы падчас рэйда бачым, што сапраўды ёсць нейкія парушэнні заканадаўства, то робім паўнамаштабную праверку фінансава-гаспадарчай дзейнасці дадзенага прадпрыемства альбо прадпрымальніка. Па выніках праверак Камітэт дзяржкантролю інфармуе адпаведныя органы: Урад, у асобных выпадках — Прэзідэнта, для таго, каб распрацаваць заканадаўчыя меры па прадухіленні такіх парушэнняў. Наша мэта — прывесці работу прыватных прадпрымальнікаў у адпаведнасць з патрабаваннямі закона, каб спажыўцы не былі ўшчэмленыя ў сваіх правах. Прадпрымальнікі павінны працаваць у межах дзеючага гаспадарчага заканадаўства, прадстаўляць свае паслугі якасна і бяспечна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗША МОГУЦЬ РАЗМЯСЦІЦЬ У ГРУЗІІ ЭЛЕМЕНТЫ ПРА



**ЗША могуць размясціць у Грузіі высокачастотны радар X-дыяпазону. Грузінскае ваеннае ведамства адмаўляецца каментаваць дадзеную інфармацыю, але мясцовыя эксперты не выключаюць магчымасці з'яўлення амерыканскай ПРА на Паўднёвым Каўказе, піша «Независимая газета».**

Аб жаданні Пентагона ўсталяваць высокачастотны радар на тэрыторыі Грузіі і Турцыі не раз казаў былы кіраўнік Агенцтва ЗША па ПРА генерал Генры Аберынг. У прыватнасці, год таму, калі ўзніклі складанасці ў перамовах паміж Вашынгтонам і Прагай аб фінансавым баку пытання размяшчэння такога радара на тэрыторыі Чэхіі, ён заявіў аб магчымасці размяшчэння падобнай РЛС у Грузіі.

Прычын таму можа быць некалькі. Па-першае, ЗША па-ранейшаму не ўдалося дамовіцца з Прагай і Варшавай аб размяшчэнні на іх тэрыторыі элементаў трэцяга пазіцыйнага раёна амерыканскай стратэгічнай ПРА. Падпісанне дамовы паміж ЗША і Чэхіяй аб дасягненні згоды на пачатак работ па стварэнні тэхнічнай пляцоўкі для X-радара недалёка ад Прагі, вызначанае на пачатак мая, так і не адбылося.

Не пераадоленыя складанасці і ў дамоўленасцях на будаўніцтва базы для 10 супрацьракет на польскай зямлі. Варшава, паводле меркавання Вашынгтона, запатрабавала занадта вялікі кошт за рызыкі для сваёй бяспекі. Да таго ж у сваёй большасці жыхары Польшчы і Чэхіі (54 і 52 працэнты адпаведна) не хочуць размяшчэння сістэмы ПРА ЗША ў сваіх краінах.

### ЛІТВА ЗРАБІЛА ДЗЕНЬ БАЦЬКІ ДЗЯРЖАЎНЫМ СВЯТАМ

**Сейм Літвы абвясціў Дзень бацькі дзяржаўным святам. Яно будзе адзначацца ў рэспубліцы ў першую нядзелю чэрвеня. Ці будзе гэты дзень кампенсавацца за кошт аднаго з працоўных дзён, парламентарыі маюць намер вырашыць у хуткім часе.**

Паводле слоў прадстаўніка Сацыял-дэмакратычнай партыі Альгірдаса Сысаса, увядзенне новага дзяржаўнага свята абумоўлена неабходнасцю ўмацавання сям'і ў літоўскім грамадстве. Дзяржаўны статус у рэспубліцы ўжо мае Дзень маці, які адзначаецца ў першую нядзелю мая.

### РАСІЙСКІЯ БІЗНЭСМЕНЫ ПРАПАНАВАЛІ ЎВЕСЦІ КАРТКІ НА ХАРЧАВАННЕ

**Расійскія бізнэсмены, якія выступалі на пасяджэнні «круглага стала» ў Грамадскай палаце, прапанавалі ўвесці ў краіне адмысловыя карткі на харчаванне. У Мінэканамразвіцця ўжо адзначылі, што катэгарычна супраць такой ініцыятывы.**

Неабходнасць прыняцця тэрміновых мераў па абароне спажыўцоў ад высокай інфляцыі паўстала пасля таго, як увосень 2007 года моцна выраслі цэны на прадукты харчавання.

У кастрычніку Ўрад дамовіўся з вытворцамі сацыяльна значных тавараў аб замарозцы коштаў, аднак тэрмін дамовы мінуў у пачатку мая. У выніку хуткім часам у Расіі можа адбыцца яшчэ адзін скачок інфляцыі на асноўныя прадукты.

### З-ЗА ЗАБАСТОЎКІ МЕДСЯСЦЁР У ШВЕЦЫІ АДКЛАДЗЕНА БОЛЬШ ЗА ПЯЦЬ ТЫСЯЧ АПЕРАЦЫЙ

**У Швецыі ўжо чацвёрты тыдзень працягваецца страйк медсясцёр, якія патрабуюць павышэння зарплаты. У сувязі з гэтым на нявызначаны тэрмін адкладзеныя як мінімум 5,5 тысячы аперацый і 20,5 тысячы абследаванняў.**

На сёння ў забастоўцы бяруць удзел больш за сем тысяч медыкаў. Члены прафсаюзаў медработнікаў патрабуюць павышэння мінімальнага заробку да 2,3 тысячы еўра і яго росту з будучага года на 180 еўра. Сёння сярэдняя зарплата шведскай медсястры складае 2534 еўра ў месяц.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.05.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 137,00 |
| 1 еўра | 3 295,79 |
| 1 латвійскі лат | 4 726,31 |
| 1 літоўскі літ | 953,80 |
| 1 чэшская крона | 131,77 |
| 1 польскі злоты | 970,61 |
| 1 расійскі рубель | 89,59 |
| 1 украінская грыўня | 445,21 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,8521 |
| 10 UAH | 48,2748 |
| 1000 BYR | 11,1493 |
| EUR | 36,8730 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 14.05.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства здания конторы торговой базы, об. пл. 227,6 кв.м, расположенного по адресу: г. Любань, ул. Кирова, 90. Начальная цена – 77 696 000 бел .руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за объект производится в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится *17 июня 2008 г.* в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по *16 июня 2008 г.* до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком.326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.** УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже, обращенного в доход государства здания столовой, об. пл. 686,9 кв.м, расположенного по адресу: Воложинский район, д. Гончары. Начальная цена – 179 755 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится *17 июня 2008 г.* в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по *16 июня 2008 г.* до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.** УНП 690324015

Прамая лінія

# КОДЭКС ПРАЦОЎНЫ, КОДЭКС ЖЫЛЛЁВЫ: ШТО, ДЛЯ КАГО І ЯКІЯ ЎМОВЫ?





**Тлумачэнне ці прафесійная парада юрыста — рэчы, неабходныя большасці з нас. Таму не выпадае здзіўляцца, што на чарговую «прамую лінію» нашай газеты патэлефанавалі больш за два дзесяткі чалавек. Нагоды тут аказаліся рознымі — работа на выхадных і ў дзяржаўныя святы, сумяшчальніцтва, водпускі, аплата «бальнічных» і, вядома, «жыллёвае пытанне». Але, як кажуць, аб усім па парадку. На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць загадчык юрыдычнай кансультацыі галоўнага прававога ўпраўлення апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімір Іванавіч ШЭЛКОВІЧ і намеснік загадчыка юркансультацыі Васіль Мікалаевіч КОРСУК.**

☎ — ***Ці меў права звольніць мяне ў 2005 годзе кіраўнік пасля заканчэння тэрміну кантракта, калі я яшчэ знаходзілася ў «дэкрэтным» водпуску? Пры гэтым ні ліквідацыі арганізацыі, ні скарачэння штатаў тады не было...***

**Галіна,** *Гродзенская вобласць*

— Цяпер кантракты з жанчынамі, па іх жаданні, павінны заключацца, прынамсі, да даты, пакуль маладому дзіцяці не спаўняецца 5 гадоў. Аднак, Галіна, гэта норма з'явілася ў заканадаўстве пазней, чым адбылося ваша звальненне, — толькі ў 2006 годзе.

Да таго ж зараз узнімаць пытанне аб правамоцнасці звальнення ў 2005 годзе, на жаль, позна. У такой сітуацыі работнік павінен звяртацца па дапамогу хутка, і ў тым ліку на працягу месяца пасля звальнення можна звяртацца ў суд.

☎ — ***Ці магу я падчас знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да ўзросце да 3 гадоў уладкавацца ў іншую арганізацыю на поўную стаўку? І ці трэба ў такім выпадку звальняцца са свайго ранейшага месца?***

**Вольга КУЛАГІНА,** *г. Мінск.*

— Выхад у водпуск па доглядзе дзіцяці да ўзросце да 3 гадоў — гэта не скасаванне працоўных адносінаў. Чалавек, які выйшаў у «дэкрэтны», застаецца работнікам арганізацыі. Таму ўладкавацца ў іншым месцы можна толькі па сумяшчальніцтве. А, паводле нашага заканадаўства, работа па сумяшчальніцтве магчыма не больш чым на 0,5 стаўкі.

Што ж да звальнення і ўладкавання ў іншым месцы, то гэта — ваша права. Аднак трэба мець на ўвазе, што ў такім выпадку ранейшае працоўнае месца за вамі ўжо не захаваецца.

☎ — ***Я працую сумяшчальнікам па кантракце, працоўная кніжка знаходзіцца па асноўным месцы, ніякага запісу аб сумяшчальніцтве ў ёй не рабілася. Ці магу я скасаваць кантракт па сумяшчальніцтве датэрмінова і як гэта зрабіць?***

***І яшчэ. Па сумяшчальніцтве адпрацавала 6 месяцаў, у сувязі з гэтым, ці павінны мне выплаціць частку кампенсацыі за нявыкарыстаны водпуск?***

**Андрэй Міхайлавіч,** *г. Мінск.*

— Звальненне з работы па сумяшчальніцтве здзяйсняецца па тых жа правілах, што і звальненне з асноўнага месца. Адно, што наймальнік можа звольніць сумяшчальніка без яго згоды ў выпадку, калі на гэта месца прымаецца работнік пастаянны.

Такім чынам, скасаваць кантракт датэрмінова работнік-сумяшчальнік можа толькі ў выпадку парушэння наймальнікам умоў кантракта або па пагадненні з тым жа наймальнікам. Пры гэтым у выпадку звальнення кампенсацыя за нявыкарыстаны водпуск павінна выплачвацца прапарцыянальна адпрацаванаму часу.

☎ — ***Ці можна будзе скарыстацца кампенсацыяй за нявыкарыстаны водпуск за гэты год пасля прыняцця новага Працоўнага кодэкса?***

**Аляксей Сцяфанавіч ЛЕМЯШЭЎСКІ,** *г. Мінск.*

— Паводле Працоўнага кодэкса, частка працоўнага водпуску сапраўды можа быць заменена на грашовую кампенсацыю. Аднак, па-першае, толькі па пагадненні паміж работнікам і наймальнікам. А, па-другое, трэба мець на ўвазе: цяпер як мінімум 21 каляндарны дзень работнік павінен выкарыстаць менавіта на адпачынак. Адпаведна, прадстаўленне кампенсацыі магчыма толькі за частку водпуску, якая перавышае гэты тэрмін.

☎ — ***Колькі дзён водпуску павінен мець галоўны бухгалтар сельсавета цэнтралізаванай бухгалтэрыі? І ці ёсць у яго надбаўка за стаж і за напружанасць?***

**Валянціна Мікалаеўна,** *Уздзенскі раён.*

— З 26 студзеня, пасля ўвядзення зменненняў у Працоўным кодэксе, працягласць водпуску ў нашай краіне складае 24 каляндарныя дні. Пры гэтым ад 1 да 5 дзён вам павінны дадаць па кантракце. А вось што да дадатковага водпуску за працяглы стаж (да 3 каляндарных дзён) ці за ненармаваны рабочы дзень (да 7 дзён), то цяпер іх прадастаўленне з'яўляецца не абавязкам, а толькі правам наймальніка. Водпускі за працяглы стаж ці ненармаваны дзень могуць прадстаўляцца толькі за кошт сродкаў наймальніка і, зразумела, што ў дадзеным выпадку ўсё залежыць ад фінансавых магчымасцяў апошняга.

☎ — ***Патлумачце, калі ласка, ці трэба выходзіць на работу па графіку ў дзяржаўныя святы? І як аплачваецца работа ў суботах і нядзелях, калі зноў-такі згодна з графікам на іх прыпадаюць змены?***

**Васіль САСНОЎСКІ,** *Валожынскі раён.*

— Работа на выхадных кампенсуецца або прадастаўленнем іншага дня адпачынку, або павышанай аплатай. Пры гэтым калі на суботу і нядзелю прыпадае змена па графіку, то, хутчэй за ўсё, вам прадастаўляюць менавіта іншыя дзень адпачынку. І ў такім разе аплата будзе звычайнай.

І па першым пытанні. Работа ў дзяржаўныя святы не супярэчыць заканадаўству толькі пры ўмове заняцці ці на бесперапыннай вытворчасці або занятасці ў сацыяльна-значных сферах — скажам, у медыцынскіх установах, гандлі, на транспарце і г.д.

☎ — ***Звяртаюся ад імя выхавальнікаў Брэсцкага абласнога цэнтра медыцынскай рэабілітацыі «Сасновы бор». Некалі ў нашай арганізацыі было вызначана, што пры 30-гадзінным працоўным тыдні мы павінны працаваць па 5 гадзін у дзень. Аднак потым быў уведзены бягучы графік, і цяпер мы можам працаваць у адзін дзень па дзве, а ў іншы — па дзесяць гадзін. Ці правільна гэта?***

***Па-другое. Ці можам мы працаваць па святах з улікам таго, што, паводле кантракта, святы ў нас павінны з'яўляцца выхаднымі?***

***І па-трэцяе. Якая працягласць водпуску ў выхавальнікаў дзіцячых цэнтраў медыцынскай рэабілітацыі, паколькі самі цэнтры адносяцца да сістэмы аховы здароўя?***

— Калі існуе бягучы графік, то, хутчэй за ўсё, у арганізацыі па ўзгадненні з прафкамам уведзены сумільаваны ўлік працоўнага часу. Пры такім уліку наймальнік мае права выназначаць, колькі гадзін вы павінны працаваць у той ці іншы дзень. Галоўнае, каб вы «ўкладаліся» ў неабходную норму гадзін у той ці іншы ўліковы перыяд — месяц, квартал, паўгода ці год.

Наконт другога пытання. Зноўтакі трэба паглядзець: артыкул 147 Працоўнага кодэкса вызначае, што ў дзяржаўныя святы і святочныя дні работа не выконваецца — за выключэннем выпадкаў, калі спыненне работы немагчыма па вытворча-тэхналагічных умовах, і выпадкаў, калі работа выклікана пастаянай неабходнасцю абслугоўвання насельніцтва.

І па-трэцяе. Пераелік арганізацый і работнікаў, працягласць асноўнага водпуску якіх складае больш за 24 каляндарныя дні, вызначана пастановай Урада №100 ад 24 студзеня 2008 года. На жаль, дзіцячыя цэнтры медыцынскай рэабілітацыі ў гэтай пастанове не прадугледжаныя. Таму ваш водпуск павінен складаць 24 каляндарныя дні плюс «дабаўку» па кантракце і, па магчымасці, «дабаўку» за працяглы стаж і ненармаваны дзень.

☎ — ***Патлумачце, калі ласка, якім чынам павінна размяркоўвацца матэрыяльная дапамога прафкама? І другое пытанне. Ці павінны ўключаць кошт прафсаюзнага падарунка да Новага года ў зарплату і, адпаведна, вылічваць з яе падаходны падатак?***

**Віталь Пятровіч,** *г. Мінск.*

— Якіх-небудзь агульных правілаў па прадастаўленні прафсаюзнай матэрыяльнай дапамогі няма, інакш кажучы, вырашаць, каму, як, калі і колькі ў дадзеным выпадку павінен сам прафкам. Або, як варыянт, усе гэтыя моманты могуць быць урэгуляваныя ў калектыўным дагаворы. Пры гэтым кошт прафсаюзнага падарунка да Новага года ўключаць у зарплату нельга. І, адпаведна, кошт такога падаходным падаткам не абкладаецца.

**Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ.**
**Фота аўтара.**

*(Працяг будзе.)*

Рэха публікацыі

# «Афарбаванае паліва на санітарна-гігіенічныя ўмовы працы і пражывання не ўплывае»

У нумары «Звязды» ад 28 сакавіка пад рубрыкай «Пытальнік» быў змешчаны ліст чытача С.В. Пратасевіча з вёскі Вароцішчы Уздзенскага раёна, які атрымаў загаловак «Ці ёсць уплыў на здароўе ад падфарбаванага паліва?» Ад імя механізатараў і вадзіцеляў РСУП «Саўгас Гарадок» заяўнік уздымаў праблему выкарыстання ў сельскай гаспадарцы памянёнага падфарбаванага паліва, дакладней, уплыву яго на здароўе вяскоўцаў.

«...Колькі шкодных рэчываў (і якіх) выкідваецца ў атмасферу і людзям пад нос ад пафарбаванага хіміяй каляровага паліва. Выхлапныя газы настолькі смярдзючыя, што па вуліцы немагчыма прайсці, калі праедзе МАЗ ці трактар. На мехдвары, калі працуе тэхніка, немагчыма знаходзіцца, чаго раней не было: патрэбен процівагаз. Людзі хвалююцца за ўласнае здароўе і здароўе сваіх дзяцей... Сімптомы пасля кантакту з выхлапнымі газамі такія: сухасць у роце, часам болі ў грудзях, баліць галава». Гэта невялікія вытрымкі з другога ліста чытача. Першы быў накіраваны ў абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, адказам якога заяўнік застаўся незадаволены. Высветліць сітуацыю па тэлефоне ў рэдакцыі, нягледзячы на звароты ў шэраг афіцыйных інстанцый, не атрымалася (напрыклад, раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі не акрэдытаваны на правядзенне замераў паветра на тэрыторыі населеных пунктаў і працоўных месцах). Таму газета мусіла звярнуцца па дапамогу ў Міністэрства аховы здароўя.

Але першым мы атрымалі адказ з Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

«З мэтай недапушчэння крадзяжу паліва ў сельгаспрадпрыемствах, па даручэнні ўрада, канцэрн «Белнафтахім» ажыццяўляе падфарбоўванне паліва: у зялёны колер — дызельнага, у сіні — бензіну. Лабараторыі Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя не займаюцца кантролем якасці паліва, а кантралююць утрыманне забруджвальных рэчываў у дымавых газах аўтамабіляў. Улічваючы, што выкіды ад транспартных сродкаў складаюць каля 70 працэнтаў ад агульных выкідаў забруджвальных рэчываў у цэлым па вобласці, кантролю гэтых выкідаў надаецца асаблівая ўвага. Штогод праводзіцца экалагічная аперацыя «Чыстае паветра». Мэта аперацыі — зніжэнне шкодных выкідаў аўтатранспарту ў атмасферу. Асноўныя намаганні аперацыі скіраваныя на праверку паветраахоўнай дзейнасці аўтапрадпрыемстваў і транспартных сродкаў ва ўмовах дарожнага руху...».

Па сутнасці ж праблемы, якую ўздымаў у сваіх лістах С.В. Пратасевіч, адказ паступіў ад намесніка міністра аховы здароўя — галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача краіны В.І. Качан.

«Міністэрствам аховы здароўя разгледжаны зварот на адрас рэдакцыі на нездавальняючыя санітарна-гігіенічныя ўмовы працы і пражывання з выездам на месца і правядзеннем лабараторна-інструментальных даследаванняў паветра рабочай зоны і атмасфернага паветра ў в. Вароцішчы на вул. Цэнтральная, 11.

Па сутнасці пастаўленых пытанняў паведамляем, што афарбоўванне аўтамабільнага паліва адбываецца ў адпаведнасці з загадамі канцэрна «Белнафтахім» ад 28.09.2007 г. № 801 і ад 22.11.2007 г. № 908 у мэтах павышэння эфектыўнасці выкарыстання гаруча-змазачных матэрыялаў у сельскагаспадарчых арганізацыях рэспублікі. Фарбавальнікі, што выкарыстоўваюцца для ідэнтыфікацыі бензінаў, дызельнага паліва і мазуту, выпрабляецца ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі і маюць сертыфікат бяспекі. Інфармацыя пра фарбавальнікі, што выкарыстоўваюцца, даведзена да ведама механізатараў і вадзіцеляў, а таксама размешчана на стэндзе па ахове працы і тэхніцы бяспекі.

Па выніках лабараторна-інструментальных даследаванняў, перавышэнняў гранічна дапушчальных канцэнтрацый хімічных рэчываў на рабочых месцах трактарыста і вадзіцеля аўтамабіля РСУП «Саўгас Гарадок», а таксама ў атмасферным паветры каля дома № 11 па вул. Цэнтральнай у в. Вароцішчы не выяўлена.

Атрыманыя вынікі даследаванняў сведчаць, што негатыўны ўплыў на санітарна-гігіенічныя ўмовы працы і пражывання насельніцтва пры выкарыстанні афарбаваных гаруча-змазачных матэрыялаў для аўтатранспартных сродкаў у РСУП «Саўгас Гарадок» адсутнічае».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РАСКЛАД РУХУ ЭЛЕКТРАЦЯГНІКОЎ ПА СТАНЦЫІ МІНСК-ПАСАЖЫРСКІ З 25 МАЯ 2008 ГОДА

### НА БАРАНАВІЧЫ, БРЭСТ

**Адпраўленне са ст. Мінск–Пасажырскі**

| Маршрут | Адпраўленне | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|
| Баранавічы | 4-16 | штодз. | б/п Курасоўшчына, Рошча, Пціч, Воўчкавічы, Бярэжа, Пяцігор'е, Станькава, Дзяржынск, Клыпаўшчына, Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |
| Стоўбцы | 7-58 | штодз. | усюды |
| Баранавічы | 9-03 | вых. | б/п Воўчкавічы, Пяцігор'е, Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Сінява, Асіпоўшчына, Вароцішча, Ліпа, Хвоева, Юшкевічы, Перамога, Крошына |
| Стоўбцы | 12-45 | штодз. | усюды |
| Баранавічы | 15-37 | штодз. хутк. | з прыпынкамі па п.п. Курасоўшчына, ст. Фаніпаль, Койданава, п.п. Дзяржынск, Энергетык, ст. Стоўбцы, Гарадзея, п.п. Пост 1 |
| Брэст | 16-17 | штодз. | б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны |
| Стоўбцы | 17-45 | штодз. | усюды |
| Стоўбцы | 18-24 | штодз. | усюды |
| Баранавічы | 20-17 | штодз. | да ст. Стоўбцы — усюды, далей з прып. па станцыях Гарадзея, Пагарэльцы і п.п. Пост 1 |
| Стоўбцы | 21-47 | штодз. | усюды |
| **Адпраўленне з п.п. Інстытут культуры** | | | |
| Брэст | 0-58 | штодз. | да ст. Памыслішча — б/п п.п. Рошча, усюды далей з прып. па станцыях і п.п. Воўчкавічы, Дзяржынск, Энергетык |
| Стоўбцы | 5-55 | штодз. | усюды |
| Стоўбцы | 7-00 | штодз. | усюды |
| Баранавічы | 7-23 | штодз. | б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны |
| Стоўбцы | 8-46 | штодз. | усюды |
| Стоўбцы | 9-23 | суб. | усюды |
| Брэст | 9-54 | штодз. | усюды |
| Стоўбцы | 11-11 | вых. | усюды |
| Брэст | 11-56 | штодз. | б/п Станькава |
| Стоўбцы | 13-05 | вых. | усюды |
| Баранавічы | 13-55 | штодз. | усюды |
| Стоўбцы | 14-39 | штодз. | усюды |
| Гарадзея | 14-58 | пт., вых. | б/п Бярэжа, Станькава, Клыпаўшчына, Мезінаўка, Атцэда, Сінява, Асіпоўшчына, Вароцішча |
| Брэст | 17-09 | штодз. | б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Сінява, Асіпоўшчына, Вароцішча, Ліпа, Хвоева, Юшкевічы, Перамога, Крошына |
| Коласава | 18-07 | пт., нядз. | усюды |
| Баранавічы | 19-04 | штодз. | усюды |
| Стоўбцы | 23-00 | штодз. | б/п Асіно, Мезінаўка, Атцэда, Кучкуны, Цёмныя Ляды |

### НА МАЛАДЗЕЧНА

**Адпраўленне са ст. Мінск–Пасажырскі**

| Маршрут | Адпраўленне | Дні | Прыпынкі |
|---|---|---|---|
| Маладзечна | 0-25 | штодз. | б/п п.п. Лябяжы, Мясота, Крыніца, Татаршчызна, Селівонаўка; па нядзелях — б/п п.п. Лябяжы, Татаршчызна, Селівонаўка |
| Маладзечна | 4-36 | штодз. | б/п п.п. Лябяжы, М. Мора, Крыжоўка, Зялёнае, Хмелеўка, Анусіна, Вязынка, Пралескі |
| Маладзечна | 5-23 | штодз. | б/п п.п. Лябяжы |
| Аляхновічы | 6-09 | штодз. | б/п п.п. Хмелеўка |
| Маладзечна | 6-38 | штодз. | б/п п.п. Лябяжы, М. Мора, Крыжоўка |
| Аляхновічы | 7-01 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 7-20 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 7-33 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 8-06 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 8-22 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 8-46 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 9-14 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 9-43 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 10-00 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 10-21 | вых. | усюды |
| Маладзечна | 11-11 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 11-48 | суб. | усюды |
| Маладзечна | 12-40 | штодз. | усюды |
| Маладзечна | 13-34 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 13-56 | нядз | усюды |
| Маладзечна | 14-46 | пт., вых. | б/п п.п. М. Мора, Раманы, Крыніца, Селівонаўка |
| Уша | 15-04 | нядз. | усюды |
| Маладзечна | 15-33 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 16-09 | пт., вых | усюды |
| Маладзечна | 16-30 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 17-18 | штодз. | усюды |
| Маладзечна | 17-36 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 17-59 | штодз. | усюды |
| Маладзечна | 18-28 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 18-58 | пт., вых. | усюды |
| Маладзечна | 19-15 | штодз. | усюды |
| Аляхновічы | 20-13 | штодз. | усюды |

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

**Пра магчымыя змяненні ў раскладзе – даведкі па тэлефоне 105**

Кватэрнае пытанне

# КАЛІ НЯМА РАДНІ

***У інтэрнатах што ні дзіця — то гора: што з такімі бацькамі, што без бацькоў, — выжывай, як хочаш.***

***Адзін з маіх выхаванцаў (маці збегла, бабуля паралізаваная, дзядзькі абодва пітушчыя і судзімыя) узяўся будаваць сабе асобнае жыллё. Заплаціў першы ўзнос, атрымаў бязвыплатную субсідыю. А вось крэдыт не даюць. Патрэбны паручыцелі. А дзе іх браць беднаму сіраце? І як быць?***

**А. Дубік,** *Клецкі раён.*

Патрабаванне банка аб наяўнасці паручыцеляў пры выдачы крэдыту на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў грунтуецца на дзеючым заканадаўстве. Паручыцельства — гэта адзін са спосабаў забеспячэння выканання абавязацельстваў па вяртанні атрыманага крэдыту і працэнтаў за карыстанне ім.

Паручыцелямі могуць выступаць з дазволу банка не толькі блізкія родныя (бацькі, дзеці, родныя браты і сёстры), але і іншыя грамадзяне (напрыклад, суседзі, сябры, калегі і г.д.), якія маюць дастатковую плацежаздольнасць.

Да афармлення крэдыту банк аналізуе плацежаздольнасць крэдытаатрымальніка і яго паручыцеляў з мэтай ацэнкі магчымасці своечасова і ў поўным аб'ёме забяспечыць пагашэнне выдадзенага крэдыту. Пры гэтым вызначаецца неабходная колькасць паручыцеляў, такім чынам, каб плацяжы па крэдыце складалі не больш за 50 працэнтаў сукупнага даходу паручыцеляў.

**Віктар САВІЦКІ.**

# Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* **№ 12 (263)**

## Май халодны — год хлебародны

**Аб набліжэнні замаразкаў на гэтым тыдні да мінус 5 градусаў паведамілі па радыё і тэлебачанні. Але вопытныя садаводы-агароднікі надыход замаразкаў самі могуць вызначыць па народных прыметах. Напрыклад, пасля цёплага дня да вечара рэзка халадае і пахаладанне ўзмацняецца да ночы, бязветрана, неба без адзінага воблачка, на глебе і траве няма расы — усё гэта сведчыць аб магчымасці замаразкаў.**

Садаводы павінны ведаць, што пры пахаладаннях нераскрытыя кветкавыя бутоны яблынь пашкоджваюцца пры тэмпературы мінус 4 градусы, кветкі, якія распусціліся, — пры мінус 2 градусах, завязі гінуць пры мінус 1—1,5 градуса.

Падрыхтуйце шчыльную паперу, рагожку, а яшчэ лепш поліэтыленавую плёнку, спанбонд — для ўкрыцця садовых суніц, якія дзенідзе ўжо цвітуць.

Самы вядомы спосаб засцерагчыся ад замаразкаў — гэта дымленне. Многія яго прымяняюць, але робяць гэта няправільна. Паляць вогнішчы з вечара і ад гэтага мала толку. Шчыльную дымавую заслону стварыце перад усходам сонца, бо менавіта ў гэты час замаразак дасягае найбольшай сілы і асабліва небяспечны. Заканчвайце дымленне гадзіны праз дзве пасля ўсходу сонца. Запальвайце не ўсе кучы адразу, частку з іх паберажыце на выпадак паўторных замаразкаў.

Кучы для вогнішчаў павінны быць заўсёды напагатове, каб не мітусіцца ў апошні час. Для іх падыдуць галінкі, якія засталіся пасля абрэзкі дрэў і кустоў. У сярэдзіну кучы пакладзіце які-небудзь сухі матэрыял. У марозныя ранішнікі вецер дзьме з усходу ці з захаду, таму кучы трэба раскласці з гэтых бакоў на адлегласці адна ад другой. Калі вы падпаліце падрыхтаваную кучу, дым абавязкова пойдзе ўверх, а трэба каб сцяліўся. Для гэтага кінцье ў вогнішча сырое лісце, вільготнае пілавінне ці проста зямлю.

Ёсць і іншыя спосабы засцерагчыся ад замаразкаў. Пракапайце ўздоўж градак баразёнкі і моцна паліце іх вадой. У садзе, і ў першую чаргу у прыствольных кругах дрэў, таксама шчодра паліце вадой. Пры выпарэнні вільгаці тэмпература ў гэтым месцы павышаецца.

Вядома ж, градку можна ўкрыць поліэтыленавай плёнкай, спанбондам, саломай, мешкавінай.

Пры надыходзе замаразкаў памідоры, кабачкі і некаторыя іншыя расліны звычайна ўкрываюць каўпакамі з тоўстай паперы, кардону ці толі. Калі няма нічога іншага пад рукой, знойдуць прымяненне разрэзаныя і згорнутыя ў некалькі слаёў старыя газеты. Яшчэ адно вырашэнне праблемы — пастаўлены ўверх дном шкляны слоік. Але пастаўце яго так, каб сценкі не дакраналіся да лістоў, а то яны могуць абмарозіцца. Часам садаводы загадзя рыхтуюць драцяныя каркасы, абцягнутыя ў некалькі слаёў плёнкай. Па сваёй канструкцыі гэтыя індывідуальныя ўкрыцці нагадваюць абажуры настольных лямпаў.

● *Калі цвіце чаромха — заўсёды бывае холадна. Асабліва бывае холадна, калі дуб распусціцца.*

● *Авёс трэба сеяць дні за два пасля або да надыходу поўніка і ніколі ў час зацьмення.*

● *Калі салавей заспяваў на голыя дрэвы, то чакай неўраджай на садавіну.*

● *Не сей пшаніцу раней дубовага ліста, г.зн. да яго з'яўлення.*

● *На Макея (24 мая) мокра — усё лета будзе мокрае.*

● *Камароў многа — дождж заўтра будзе, камароў мала — аўса і траў не будзе, многа мошак — рыхтуй па грыбы кошык.*

● *З Пахома (28 мая) устанаўліваецца зусім летняе надвор'е.*

● *Дуб перад ясенем ліст пусціць — да сухога лета.*

● *Зацвітанне бэзу супадае з першым летнім цяплом, з душнымі начамі. Цвіценне вішні — сігнал для лёту капуснай, маркоўнай і цыбульнай мухі, капуснай молі і капуснай бялянкі. Трэба прадугледзець меры барацьбы з імі. Часам у канцы мая здараюцца замаразкі, таму неабходна прыняць меры аховы раслін цеплалюбівых культур.*

● *Вечарам або ноччу неба зацягнула хмарамі — замаразкаў не будзе.*

● *Замаразкі прыметна змяншаюцца або зусім знікаюць, калі вечарам ці ноччу з'яўляецца раса. Адбываецца гэта таму, што пры расе выдзяляецца вялікая колькасць цяпла, якое награвае калязямны слой паветра.*

● *Калі на паверхню вады выплыла лісце гарлачыка белага — замаразкаў не будзе.*

## Каляндар кветкавода



Цюльпаны і нарцысы ў стадыі бутанізацыі і чакаюць падкормкі. Падкарміце іх настоем каравяку (1:10) ці настоем мінеральных угнаенняў. Пасля зрэзвання кветак яшчэ раз падкарміце гэтыя расліны. У цюльпанаў трэба пакінуць хоць бы 2—3 ніжнія лісты для сілкавання цыбуліны, у нарцысаў іх пакідаюць поўнасцю.

Пачынаюць высаджваць больш цеплалюбівыя летнікі: дэкаратыўную фасолю, іпамею і інш..

Высаджваюць у грунт вяргіні пасля таго, як мінуць замаразкі. Розныя шматгадовыя кветкі і ружы падкормліваюць поўным мінеральным угнаеннем (20 г аміячнай салетры, 30 г суперфасфату і 20 г калійнай солі на 1 кв. м), мульчыруюць глебу торфам. У бэзу сістэматычна выдаляюць дзікія парасткі.

Для нармальнага развіцця півоняў іх трэба падкарміць за лета не менш як тры разы. Каб спрасціць работу, вясной можна ля кожнага кусціка на адлегласці 40—50 см зрабіць з чатырох бакоў вострым колам шурфы на глыбіню 30 см. У кожны шурф насыпаць мінеральных угнаенняў: азоцістых 30 г, калійных — 25 і фосфарных 20 г, шурф запоўніце вадой. Мінеральныя ўгнаенні, раствараючыся, будуць насычаць пажыўнымі солямі слой зямлі ля каранёў півоні.



Дзеляць старыя кусты флёксаў, дэльфініумаў, карэйскай хрызантэмы і позні прымулы. Каб паскорыць размнажэнне прымул, іх можна чаранкаваць. Прыкладна ў сярэдзіне мая ўсе сцёблы або іх частку шчыльна прыгінаюць да зямлі і прышпільваюць. Затым засыпаюць рыхлай пажыўнай глебай, якую заўсёды падтрымліваюць вільготнай. Да восені сцёблы ўкараняюцца.

Каб хрызантэмы лепш развіваліся, іх высаджваюць на лета ў адкрыты грунт. Раннія іх гатункі лепш вырошчваць без гаршкоў, гэта садзейнічае развіццю каранёў. Позднія гатункі, якія ўвосень пераносяць у памяшканне, высаджваюць у гаршках, але павялічваюць дрэнажную адтуліну альбо закапваюць гаршкі на 4—5 см ніжэй за ўзровень глебы. Пасля пасадкі іх мульчыруюць слоем перагною і паліваюць.

У канцы мая ў парніку пасля расады летнікаў дабаўляюць зямлю і рыхтуюцца да пасеву шматгадовых кветак.

На ўрадлівых глебах часта размнажаюцца мядзведкі. Для барацьбы з імі можна запраўляць у зямлю вакол раслін спецыяльна падрыхтаваную атруту з цыбулі, падсмажанай на алеі, мукі і гексахларану — усё гэта перамешваецца ў роўных частках так, каб атрымалася густая клейкая маса, з якой робяць камочкі.

Прафілактычныя апрацоўкі раслін ядахімікатамі лепш за ўсё праводзіць у маі, калі шкоднікі і ўзбуджальнікі хвароб яшчэ толькі пачынаюць з'яўляцца. Шматгадовыя флёксы трэба апрацаваць супраць белай плямістасці 0,5—1-працэнтнай бардоскай вадкасцю або іншымі прэпаратамі, якія змяшчаюць медзь. Калі на ўчастку ёсць расліны, заражаныя флёксавай сцябловай нематодай, то чаранкаваць флёксы трэба толькі да чэрвеня. У гэты час нематода яшчэ знаходзіцца ў ніжняй частцы сцябла, і чаранкі бываюць незаражанымі.

Каб засцерагчы ад шэрай плесні півоні, лілеі, ружы і іншыя дэкаратыўныя расліны, трэба іх апырскаць 2—3 разы прэпаратамі, якія ўтрымліваюць медзь, серу, паўтарыўшы апрацоўку праз 7—10 дзён. Цюльпаны, паражоныя шэрай плесняй, трэба выкінуць з участка і знішчыць.

Высаджваць кветкавыя культуры штогод на адных і тых жа ўчастках не варта, таму што ў глебе могуць накопліваецца ўзбуджальнікі хвароб. Таму важна захоўваць культуразварот. Напрыклад, астры можна садзіць на ранейшае месца толькі праз 5—7 гадоў, гладыёлусы і цыбульныя — праз 4—5 гадоў. Участкі трэба апрацоўваць ядахімікатамі. Прэпараты, асабліва фармалін, лепш дзейнічаюць, калі тэмпература глебы будзе вышэй за плюс 10 градусаў.

## Падкормка бульбы

***«Якія ўгнаенні лепш уносіць пад бульбу і калі гэта рабіць»?***

**Кацярына ШУЛЯК,** *Барысаўскі раён.*

Для таго, каб бульба расла і давала ўраджай, патрэбны як арганічныя, так і мінеральныя ўгнаенні. Арганічныя: гной (вадкі, паўвадкі, на саламянай падсцілцы, торфагноевыя кампосты, птушыны памёт), зялёныя ўгнаенні і іншыя аказваюць станоўчы ўплыў на біялагічную актыўнасць і фізічную ўласцівасць глебы.

Прытрымліваючыся рэкамендацый Інстытута бульбаводства, на пясках і супесях лепш за ўсё **арганічныя ўгнаенні** ўносіць вясной, бо ўнесеная пад зіму частка пажыўных рэчываў лёгка вымываецца, а вось на цяжкіх глебах больш спрыяльна арганічныя ўгнаенні ўносіць увосень.

З **мінеральных угнаенняў** расліны атрымліваюць пажыўныя рэчывы — азот, фосфар, калій, кальцый, бор, медзь — у самы ранні перыяд росту і развіцця. Прымяняюцца ўгнаенні і для павышэння ўстойлівасці бульбы да хвароб.

З **калійных угнаенняў** найбольш распаўсюджаны **хлорысты калій**. Ён выпускаецца ў выглядзе гранул ці буйназярністых крышталікаў. Уносіць яго рэкамендуецца ўвосень пад перакопку, каб знізіць адмоўнае ўздзеянне хлору. Больш прыдатныя для бульбы бясхлорныя формы калійных угнаенняў: **сернакіслы калій, калімагнэзія**. Яны паляпшаюць якасныя паказчыкі харчовай і насеннай бульбы. Уносіць іх у глебу трэба пераважна вясной.

Пры недахопе **азоту** аслабляецца рост расліны, зніжаецца ўраджай і колькасць крухмалу ў клубнях. Лішак азоту прыводзіць да змянення перыяду вегетацыі, празмернага росту тканак. Сярод азотных угнаенняў найбольшая доля належыць **аміячнай салетры і мачавіне**. Лепшым азотным угнаеннем для бульбы з'яўляецца сульфат амонію. Істотнага росту ўраджайнасці пры яго ўнясенні не назіраецца, але павышаецца якасць клубняў, павышаецца ўтрыманне ў іх крухмалу, яны менш паражаюцца паршой.

**Фосфар** садзейнічае развіццю каранёвай сістэмы на ранніх этапах росту бульбы і паскарае яе выспяванне. Асноўныя фосфарныя ўгнаенні — **суперфасфат і сульфат амонію**.

Да **комплексных угнаенняў** адносіцца попел дроў, саломы і іншых прадуктаў арганічнага паходжання. У попеле акрамя фосфару, калію і кальцыю змяшчаецца магній, жалеза, бор, марганец, але няма хлору, таму ён з'яўляецца каштоўным угнаеннем. Уносіцца попел пры асноўнай апрацоўцы глебы або як падкормка.

Устаноўлены ўплыў **мікраэлементаў** на паскарэнне развіцця раслін, працэсаў плодаўтварэння. Мікраэлементы садзейнічаюць больш ранняму накапленню масы клубняў, павялічваюць ураджайнасць бульбы. Найбольш важнымі мікраэлементамі для бульбы з'яўляюцца бор, медзь, цынк. Калі іх не хапае клубням, лупіны робяцца шурпатымі, растрэскваюцца, ствараюцца спрыяльныя ўмовы для пранікнення хвароб, у прыватнасці, паршы.

## ЗАХАЦЕЛАСЯ ЛЕСНІКУ ПАРАСЯЦІНЫ...

Жыхар вёскі Міхалькі Гомельскага раёна, мясцовыя ляснік, адправіўся на паляванне. У лес, вядома, які, па ідэі, з'яўляўся клопатам яго службовага абавязку. У памочніках быў сусед, які любіў шашлыкі. Пад іхні стрэл трапіла ў балацянцы свінка звыш чатырох пудоў вагі. І калі мужыкі натхнёна расказвалі адзін аднаму, як яны будуць гатаваць далікатэсы, на іх шляху дадому сустрэліся члены рэйдавай брыгады з таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Справай займаецца міліцыя.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**


# ОАО «Минский приборостроительный завод»

**220005, г. Минск, пр. Независимости, 58,**
**тел.: 293 04 13, 293 99 21, 284 98 54, факс 331 41 97**

**ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ**

в переговорах по выбору подрядной организации на выполнение текущего ремонта литейного участка в корпусе 28 (побелка потолка, высота этажа 7 м), расположенного на территории завода. Срок выполнения работ — май—июнь 2008 г.

**Дата и время проведения переговоров: 22.05.2008 г. в 10.00.**

Источник финансирования проектных работ — собственные средства ОАО «Минский приборостроительный завод».

*Конкурсные предложения принимаются до 16.00, 21.05.2008 г. по адресу: 220005, г. Минск, пр. Независимости, 58.*


## ПОМНІК... РАГУЛІ

**Нядаўна мы паведамлялі пра тое, што ў Гомелі з'явіліся помнікі дворніку і пасажыру, якія яшчэ больш упрыгожылі горад над Сожам. І калі яны былі плёнам працы прафесійных скульптараў і дызайнераў, дык апошні помнік на Гомельшчыне стварылі вясковыя ўмельцы.**

Гаворка ідзе пра макет каровы ў натуральную велічыню, устаноўлены на малочнатаварнай ферме населенага пункта Уборкі Лоеўскага раёна.

На ўрачыстасцях з гэтай нагоды гучалі песні, ставіліся інсцэніроўкі, праводзіліся конкурсы на малочную тэматыку. А ў фінале ўшанавання рагулі ўсе прысутныя пілі... малако і «закусвалі» пернікамі.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Частное торговое унитарное предприятие «Мобиллюкс» **ликвидируется.** Претензии принимаются по тел. 8 029 352 56 31 в течение двух месяцев. Свидетельство № 190470449 считать недействительным.

